# АД ЧАСОЎ ПЕРШАБЫТНЫХ

# 1917

## ЗЯМЛЯ НАШЫХ ПРОДКАЎ

Прырода надзяліла зямлю Слаўгарадчыны багатымі дзічынай лясамі, прыдатнымі для рыбалоўства рэкамі з бясконцай колькасцю старыц і заток, урадлівымі глебамі. Калі да гэтага дадаць мноства пясчаных пагоркаў на поплаве Сожа і яго прытокаў і незлічоныя запасы крамянёвай сыравіны, стане зразумелым, чаму чалавек пасля з'яўлення ва ўсходняй Беларусі трапіў і сюды, на берагі Сожа, Проні і іх прытокаў.

Як мяркуюць даследчыкі, край гэты быў абжыты яшчэ ў старажытнакаменным веку. Аб гэтым сведчаць археалагічныя знаходкі — адзінкавыя прылады працы, зробленыя чалавекам прыкладна 100—40 тыс. гадоў назад. Яны былі знойдзены зусім побач — каля в. Абідавічы Быхаўскага і каля пас. Свяцілавічы Веткаўскага раёнаў. Гэта скрэблы і востраканечнікі, якімі карысталіся так званыя неандэртальцы (нашчадкі пітэкантрапаў і продкі выкапнёвых людзей сучаснага выгляду), стварыўшыя мусцьерскую культуру.

Старажытны чалавек паляваў на маманта, валасатага насарога, мядзведзя і іншых жывёлін, збіраў ядомыя ягады, грыбы, расліны, магчыма, лавіў рыбу. Ён будаваў жытлы з костак маманта, вырабляў вялікі асартымент прылад працы з крэменю, костак і дрэва.

Знаходкі рэштак маманта каля Слаўгарада і в. Гайшын, высокія стромкія берагі Сожа, прыдатныя для загоннага палявання, крэйдавыя адклады з вялікай колькасцю крамянёвых валуноў даюць падставу меркаваць аб магчымасці пранікнення чалавека на тэрыторыю раёна і ў верхнім (познім) палеаліце.

Наступны этап засялення тутэйшых мясцін пачаўся са з'яўленнем чалавека ў эпоху мезаліту (сярэднекаменны век, 11—7 тыс. гадоў назад). З тае пары ён ніколі не пакідаў берагоў Сожа.

У сувязі з інтэнсіўным развіццём рыбалоўства і палявання, зменай клімату, жывёльнага і расліннага свету чалавек удасканальваў зброю, вынайшаў лук і стрэлы. Тэрыторыя Слаўгарадскага раёна была ў той час ужо добра абжытая. Спачатку тут маглі затрымацца на некаторы час плямёны так званай грэнскай, а ў познім мезаліце сожскай археалагічнай культуры. Археалагічная культура — умоўнае паняцце. Яно ўключае ўсю сукупнасць рэштак старажытнасці: прылады працы, зброю, рэчы побыту, рэшткі пахаванняў і жытлаў і інш. Як правіла, гэта зауж-



Мезалітычнае паселішча каля в. Кліны.

ды нейкая частка таго, што належала і чым карыстаўся чалавек у пэўны адрэзак часу на пэўнай тэрыторыі. Рэканструяваць гэтыя рэшткі і на аснове іх аналізу аднавіць асноўныя рысы сацыяльна-эканамічнага развіцця тых ці іншых старажытных плямён — задача археолага. З гэтых асцінлых урывачных звестак з мінулага і складаецца гісторыя далетапіснага часу.

Лепей за ўсё захоўваюцца прылады працы з крэменю, каменю, металу і гліняны посуд. На некранутых цывілізацыяй кавалках зямлі можна знайсці рэшткі жытлаў, могільнікаў, старажытныя вогнішчы. Горш за ўсё ці амаль не захоўваюцца рэчы арганічнага паходжання — з дрэва і костак. Але дзе-нідзе на дне рачных затокаў ці ў тарфяніках знаходзяць і гэтыя рэчы. Менавіта каля в. Лясная з р. Ляснянка выцягнулі свідраваную рагавую сякеру.

Паступова колькасны склад вырабаў значна павялічыўся. Гэта і зброя (наканечнікі стрэл), і прылады для апрацоўкі забітых жывёлін і іх скур (сякеры, скрабкі, нажы), костак (разцы), дрэва (скоблі), пашыву вопраткі (праколкі) і шмат іншых.

Напрыклад, у час раскопак мезалітычнай стаянкі каля в. Кліны А.Г.Калечыц выявіла больш за 12 тыс. знаходак. Сярод іх пераважалі адходы крамянёвай вытворчасці, але было шмат гатовых вырабаў і іх загатовак.

Паселішча размяшчалася ўздоўж краю шасціметровай тэрасы левага берага Сожа на плошчы амаль 800 м². Знойдзены рэшткі некалькіх агнішчаў і месцы, дзе выраблялі крамянёвыя рэчы.

Захаваліся рэшткі і другога мезалітычнага паселішча каля в. Старая Каменка (урочышча Рубанаў курган). Выявіў яго яшчэ ў 1920-я гады вядомы беларускі археолаг К.М.Палікарповіч.

Адзінкавыя знаходкі, галоўным чынам наканечнікі стрэл, зробленыя з пласцін, мезалітычнага ўзросту, былі

знойдзены ў тыя гады і каля вёсак Таўкачоўка, Рудня, Дубна і іншых. Але было б памылкова на іх падставе датаваць цэлыя помнікі, тым больш, што яны знойдзены сярод непараўнаўча больш позніх матэрыялаў. Хутчэй за ўсё ў іх як у люстэрку адлюстраваны вопыт пакаленняў. Яны, як і іншыя архаічныя рэчы, як і старажытныя назвы мясцін, захавалі неўміручую гістарычную памяць.

У канцы 5-га — пачатку 4-га тысячагоддзя да н.э. жыхары Пасожжа навучыліся вырабляць гліняны посуд. З яго з'яўленнем звязана станаўленне новай гістарычнай эпохі — неаліту (новы каменны век). Гэта быў час першага буйнога грамадскага падзелу працы і ўзнікнення вялікіх племянных аб'яднанняў. У той час Слаўгарадчыну, як і ўсё Пасожжа, насялялі плямёны верхнедняпроўскай культуры. Каранямі яна паглыбляецца ў мясцовы мезаліт, а ў плане гістарычнага лёсу насельніцтва пашыраецца далёка на поўнач, на Валдай.

Посуд рабілі шляхам паслядоўнага налепу гліняных стужак. Пры гэтым атрымлівалі востра- і акругладонныя гаршкі розных памераў, у залежнасці ад прызначэння. Для захавання запасаў гаршкі былі вялізныя і больш простыя, для рытуальных мэт меншыя і ўпрыгожаныя каля дна з двух бакоў. Напачатку сценкі пасудзін былі тоўстыя, у цеста дадавалі шмат раслінных дамешкаў, абпал быў зусім дрэнны. Арнаментацыю ўтваралі адбіткі грэбеня ці ямкавыя ўціскання, зробленыя па ўсёй паверхні гаршка або толькі знізу і зверху. З цягам часу яна значна ўскладнілася. Выкарыстоўваючы больш за сотню разнастайных элементаў, утваралі не менш як 130 матываў, з якіх складаліся сістэмы. Гэта былі рамбічныя, трохвугольныя, зігзагападобныя, дыяганальныя, ямкавыя і іншыя ўзоры. Рабілі іх з дапамогай завостраных палачак, костак дробных жывёл ці белямнітаў з крэйдавых адкладаў, якія завуць у народзе «чортавымі пальцамі».

Адметнымі рысамі верхнедняпроўскай культуры былі тры тыпы посуду: шыракагорлыя, прамасценныя, якія звужаліся да вострага дна; вастрадонныя, злёгку выпуклыя з адагнутым вонку венчыкам; акругладонныя нізкія гаршкі, шэраг ямак пад венчыкам, перавага грабеньчатага арнаменту побач з ямкавым і лапчастым арнаментамі.

Сыравінай для вырабу прылад працы па-ранейшаму былі крэмень, косць і рог, дрэва. З'явіліся новыя формы наканечнікаў стрэл (рамбічныя і трохвугольныя, якія прыйшлі на змену пласціністым мезалітычнага часу), мноства добра апрацаваных сякер, цяслаў (прылады для даўблення лодак). Пашырыліся прыёмы двухбаковай апрацоўкі крэменю, шліхтавання. Рыбалоўства пачало адыгрываць у гаспадарцы не менш важную, чым паляванне, ролю.

Шчыльнасць насельніцтва значна ўзрасла. Рэшткі неалітычных паселішчаў знойдзены вышэй вусця р. Лабжанка (в. Аляксандраўка), на поўнач ад вусця р. Проня каля воз. Калодзеж (в. Бярозаўка), ва ўрочышчах Белая гара, Пікаварня, каля могілак, Сямёнаўка і інш. (в. Гайшын), ва ўрочышчах Закота, Крушынне каля воз. Удуха (в. Дабранка), Падмуглеўе, Ганчароўка, Збішча каля воз. Святое, Купальня (в. Дубна); за 0,5 км на ўсход ад в. Казакоўка; на ўсходнім беразе воз. Чырвонае, на поўдзень ад вусця р. Нямыльня; на ўсход ад воз. Іўнае, ва ўрочышчах Івенская Струга, Белахвостава поле, Востраў, каля воз. Іўнае, ва ўрочышчах Хомкін бераг (в. Крамянка), Рабаўка (в. Міхайлоў), Грыўка, Курган, Анціпаў бераг, Равок, каля мелавых кар'ераў (в. Рудня); каля Слаўгарада, урочышчы Узлужжа каля прыстані, Востраў, Замкін



Крамянёвыя прылады працы са стаянкі каля в. Кліны.

бераг, Цёмная Грыва, або Бубенцы; каля воз. Дрышцава, Башарына поле, Сасновая Грыва, або Саснавец, Жураваўка, Завань (в. Старая Каменка).

Гэты спіс не вычэрпвае ўсе крыніцы. Помнікаў каменнага веку, у тым ліку і неалітычных, на Слаўгарадчыне значна больш. Але дакладна датаваць кожны можна толькі пасля раскопак. Распачаты яны былі ў 1960-я гады І.І.Арцёменкам каля в. Дубна і працягнуты А.Г.Калечыц у 1980-я гады каля в. Кліны.

У час раскопак каля в. Дубна там, дзе ўздоўж заходняй ускраіны берага воз. Святога размешчана невялікае ўзвышша (урочышча Купальня), І.І.Арцёменка выявіў рэшткі паселішча неалітычнага часу на плошчы амаль 10 тыс. м$^2$. У раскопе плошчай 72 м$^2$ былі знойдзены 70 прылад працы і рэшткі 5 гліняных пасудзін. Амаль усе знаходкі канцэнтраваліся на невялікай плошчы ўнутры жытла, якое было наземным, слупавай канструкцыі, няправільнай прама-



Фрагменты пасудзін эпохі неаліту, знойдзеныя ў час археалагічных раскопак каля в. Дубна.

вугольнай формы. Яго памеры 2х2,25 і 1,75х2,85 м.

Гэта толькі адна з формаў домабудаўніцтва той пары. Зусім побач, каля в. Струмень Кармянскага раёна раскапаны рэшткі 5 паўзямлянкавых круглых жытлаў плошчай ад 4 да 12 м². Яны мелі агнішчы і гаспадарчыя ямы ў падлозе. У час раскопак каля в. Кліны прыдатныя для жыцця пячоркі былі заўважаны яшчэ пры вывучэнні мезалітычнага паселішча. На поўнач і захад ад той шасціметровай тэрасы на поплаве былі відаць пясчаныя гурты. Яны мелі назвы Мсціж, Туфлі і Грыўка, на іх былі знойдзены неалітычныя матэрыялы. Паводле складу прылад, аздабленню пасудзін помнікі з'яўляюцца тыповымі для паселішчаў позняй пары верхнедняпроўскай культуры.

Цікавасць выклікала незвычайная пабудова ва ўрочышчы Мсціж. Вузкая (0,7 м) глыбокая (да 1 м) яма нагадвала нару (там мог уладкавацца дарослы чалавек седзячы). У ёй знойдзены рэшткі агнішча і прылады працы. Магчыма, гэта было ахвярнае месца ці індывідуальнае месца майстра. З дапамогай агнішча ён мог саграваацца.

У ваколіцах Кліноў так і цягне на нешта таямнічае. Вельмі незвычайныя тут мясціны і вельмі шмат павер'яў навокал. Хто не чуў пра Сіні калодзеж ці русалачку, якая сядзіць і плача горкімі слязамі каля возера, з якога выцякае р. Галубіца. Хто не чуў пра славутыя камяні каля Слаўгарада, на беразе Сожа, ці каля в. Віравая на беразе Проні? Гістарычную цікавасць маюць каменныя бабы (адна з іх знойдзена ў Слаўгарадзе, у садзе памешчыка), каменныя крыжы, святыя крыніцы, студні, свідраваныя каменныя сякеры, якія ў народзе завуць яшчэ «грамавымі стрэламі». Знаходзяць іх часцей за ўсё на ворыве, а захоўваюцца яны ў школьных музеях і ў калекцыянераў. На жаль, многія з гэтых рэчаў не маюць дакладных прывязак.

Археолагі вельмі ўважліва ставяцца да гэтых знаходак, бо выраблялі іх ў пэўны гістарычны перыяд, часцей за ўсё ў бронзавым веку, які наступіў у пачатку 2-га тысячагоддзя да н.э. і прыйшоў на змену каменнаму веку.

У пачатку яго на Слаўгарадчыну прыйшлі так званыя «шнуравікі» (носьбіты культуры шнуравой



Фрагменты ляпных пасудзін эпохі неаліту і бронзавага веку, знойдзеныя каля в. Кліны.

керамікі), са з'яўленнем якіх на прасторах Еўропы адбыліся значныя перамены. Яны прынеслі з сабой навыкі земляробства і жывёлагадоўлі, выраблялі баявыя сякеры і ўпрыгожвалі свой посуд адбіткамі шнура.

На Падняпроўі ўзнікла і распаўсюдзілася сярэднедняпроўская культура. Узаемаадносіны прышлых плямён з мясцовым насельніцтвам, перабудова ў грамадскім жыцці і ідэалогіі этнічна розных плямён склалі галоўную сутнасць гістарычнага працэсу таго часу. Эканамічныя сувязі паміж прышэльцамі і мясцовымі плямёнамі няспынна ўзмацняліся і прывялі да істотных змен у вытворчых адносінах. Бурнымі тэмпамі працякалі і этнічныя працэсы, у выніку чаго ўзніклі новыя этнічныя аб'яднанні. Першабытнаабшчынны лад уступіў у стадыю распаду.

Для актыўнага развіцця вытворчых формаў гаспадаркі неабходны былі палі, лугі. Пачалося актыўнае асваенне прырэчных прастораў. Высечка і выпальванне лесу, грабежніцкія паходы і ўзброеныя сутычкі, якія ўзнікалі ў выніку маёмаснай няроўнасці, патрабавалі вялікай колькасці свідраваных каменных сякер і моцнай зброі. На трохвугольных наканечніках стрэл з'явіліся шыпы, з іх дапамогай можна было нанесці больш балючую і цяжкую рану.

Каменныя і крамянёвыя сякеры вядомы па знаходках з вёсак Вялікая Зімніца, Лясная, Ляцягі, Улукі, Шаламы. А каля в. Кульшычы ў розныя часы знаходзілі суцэльныя наборы

такіх рэчаў. Сярод іх ёсць з чарашком, 2 тоўста- і 2 тонкаабушковыя, свідраваныя лопасцевыя, акруглаабушковая, малаткападобная і клінападобная сякеры, авальная матыка.

Адсутнасць руд каляровых металаў была прычынай вельмі рэдкіх знаходак вырабаў з іх. На ўсім Пасожжы знойдзена каля 30 вырабаў з медзі і бронзы. На думку вучоных, яны трапілі сюды з Каўказа ці Карпат. Мясцовая бронзаліцейная вытворчасць спецыялізавалася на перапрацоўцы гатовых зліткаў. Затое крэменеапрацоўка ў гэты час дасягнула росквіту. Значна лепш абпаленым стаў посуд. Побач з адбіткамі шнура для ўпрыгожвання пасудзін ужывалі лінейны штамп, які складаў трохвугольныя, ялінкавыя і іншыя кампазіцыі.

Дыферэнцыяцыя грамадства ў гэты час добра прасочваецца пры вывучэнні могільнікаў. Разам з безынвентарнымі вядомы багатыя пахаванні са шматлікімі рэчамі з бурштыну, косці. Нябожчыкаў хавалі пад курганнымі насыпамі і ў грунтавых ямах паводле абраду трупаспалення і трупапалажэння.

Рэшткі посуду бронзавага веку знойдзены практычна на ўсіх неалітычных паселішчах. «Чыстыя» паселішчы гэтага часу на тэрыторыі раёна, як практычна і на ўсім Пасожжы, невядомы і спецыяльна не вывучаліся. Найбольш значныя матэрыялы сярэднедняпроўскай культуры знойдзены ў ваколіцах вёсак Аляксандраўка, Гайшын, Глінка, Дубна, Кліны, Крамянка, Рудня, Старая Каменка, г. Слаўгарад.

Грунтавы могільнік выяўлены І.І.Арцёменкам каля в. Вялікая Зімніца, дзе на глыбіні 1,6 м было пахаванне скурчанага на баку чалавека, арыентаванага галавой на поўнач. Каля чэрапа нябожчыка ляжала каменная сякера, а каля таза — паліравальная пліта з пясчаніка.

Аналагічны могільнік быў знойдзены і ва ўрочышчы Сасновая Грыва (Саснавец) каля в. Старая Каменка.



Фрагменты пасудзін бронзавага веку, знойдзеныя ва ўрочышчы Курган каля в. Рудня.

Невялікая вышыня, моцна расплывістыя насыпы даюць падставу меркаваць, што ў бронзавым веку былі насыпаны і курганы каля в. Гайшын, якія ланцужком цягнуцца ўздоўж берага Сожа на поўдзень ад вёскі.

На тэрыторыі неалітычнага паселішча на заходняй ўскраіне в. Дубна І.І.Арцёменка знайшоў і раскапаў 3 курганы з 12 пахаванымі. Пад насыпам першага кургана было 8 магіл. Рэчаў не знойдзена. Авальныя ямы мелі сляды спарахнелага дрэва ад перакрыцця магіл. У другім кургане былі рэшткі шкілета і тры магільныя ямы без рэчаў. У трэцім — знойдзены абпаленыя рэшткі шкілета.

Магчыма, яшчэ адно пахаванне эпохі ранняй бронзы было раскапана за 2,6 км на поўнач ад в. Дубна, каля дарогі ў в. Кліны. У адным з дзесяці раскапаных курганоў знойдзены рэшткі шкілета, пахаванага на левым баку ў скурчаным становішчы галавой на поўдзень. Пахаванне таксама безынвентарнае.



Фрагменты ляпных пасудзін, знойдзеныя ў насыпах курганоў каля в. Дубна.

У сярэдзіне 2-га тысячагоддзя да н.э. Пасожжа засялілі плямёны сосніцкай культуры (сярэдні бронзавы век). Насельніцтва выраблялa кераміку цюльпанападобнай слоікавай формы. Пасудзіны былі пласкадонныя з шырокім горлам і тулавам, якое звужалася ў ніжняй частцы. Зрэдку арнаментавалася ўся паверхня, часцей — верхняя частка гаршкоў. Пад венчыкам рабілі шэраг ямак, зусім такіх, як у неаліце. Асноўнымі элементамі арнаменту былі адбіткі кропкавага штампа і ланцужок цыліндрычных наколаў. Зрэдку наносілі адбіткі шнура і буйнога грэбеня. Вельмі характэрныя сэрцападобныя з чарашком наканечнікі стрэл. Рэшткі такога посуду і адзінкавыя наканечнікі сустракаюцца і на помніках Слаўгарадчыны.

Позні перыяд бронзавага веку на Пасожжы вывучаны слаба.

У VII–VI стагоддзях да н.э. на большай частцы тэрыторыі Беларусі, у тым ліку і ў басейне Сожа, наступіў жалезны век. Яго пачатак адпавядае шырокаму распаўсюджанню важнейшага вынаходніцтва — здабычы жалеза з балотнай руды, запасы якой на Беларусі былі незлічоныя. З той самай гліны, якая тысячагоддзямі служыла чалавеку для вырабу посуду, пачалі будаваць сырадутныя печы, палівам для якіх служыў драўляны вугаль. З выплаўленага ў гэтых пячах жалеза рабілі сякеры і нажы, сярпы, наканечнікі стрэл і дзід і іншыя прылады працы, зброю і ўпрыгожанні. Моц і надзейнасць гэтых вырабаў хутка амаль поўнасцю выцесніла крамянёвыя прылады. Пэўны час існавалі толькі свідраваныя каменныя сякеры. Рэзка ўзрасла прадукцыйнасць працы, пашырылася ляднае земляробства. Добрыя ўраджаі спрыялі і развіццю жывёлагадоўлі, даючы корм для ўтрымання статку ў стойлавы перыяд.

Рост маёмаснай няроўнасці рэзка павялічыў колькасць узброеных сутыкненняў, рабаванняў. У сувязі з гэтым насельніцтва вымушана было пераходзіць у час небяспекі з адкрытых паселішчаў на ўмацаваныя гарадзішчы. Іх будавалі на найбольш узвышаных і цяжкадаступных месцах (мысы ў далінах рэк, сярод балот), дадаткова ўмацоўвалі валамі і равамі, частаколам. Паступова гарадзішчы сталі асноўным тыпам паселішчаў на Пасожжы.

Некалькі гарадзішчаў і селішчаў жалезнага веку вядомы і на тэрыторыі Слаўгарадскага раёна. Сярод іх адзначым вядомае каля в. Азарычы. Размешчана яно за 1,5 км на захад ад вёскі паміж 2 ярамі на левабярэжжы

р. Раста, узвышаецца над узроўнем ракі на 10—12 м. Пляцоўка памерам 20х18 м з аднаго боку абмежавана ракой, з двух бакоў — ярамі, з боку поля ўмацавана падковападобным валам вышынёй да 4 м.

Іншую канфігурацыю мае гарадзішча жалезнага веку каля в. Чырвоная Слабада. Мясцовая яго назва Гарадзец. Дарэчы, слаўгарадчане звычайна завуць гарадзішча назвамі Гарадок, Гарадзец, Замкавая гара і расказваюць паданні аб праваліўшыхся ў гэтых месцах цэрквах, калодзежах, агародах і інш. Аб курганах гавораць, што гэта магілы волатаў або пахаванні шведаў. Гарадзішча каля Чырвонай Слабады знаходзіцца за 1 км на поўнач ад вёскі на правым беразе р. Проня. Пляцоўка яго чатырохвугольная памерам 30х50 м, з боку поля ўмацавана валам вышынёй каля 2 м, ровам глыбінёй 1,5 м. Бываюць і кальцавыя ўмацаванні і нават у некалькі радоў, як, напрыклад, на гарадзішчы каля в. Васькавічы. Тут пляцоўка акружана ўнутраным кальцавым валам і двума вонкавымі з боку поля. Ёсць і рэшткі равоў перад валамі.

Шматразова засялялася найбольш вядомае слаўгарадчанам гарадзішча ў самім горадзе. Завецца яно Замкавая гара. Размешчана на высокім правым беразе Сожа, каля вусця р. Проня (зараз у гарадскім парку). Пляцоўка памерам 40х95 м выцягнута з поўдня на поўнач. Вышыня над узроўнем ракі каля 30 м. Шырынёй каля 20 м, глыбінёй 11 м. З заходняга боку ўмацавана ровам. У 1967 г. Г.В.Штыхаў, у 1974 г. М.А.Ткачоў, у 1988 г. А.А.Мяцельскі правялі на гарадзішчы раскопкі. Перамешаны культурны пласт месцамі дасягаў 1,8 м і ўтрымліваў матэрыялы эпохі неаліту, розных культур жалезнага веку і Кіеўскай Русі. Выяўлены драўляныя ўмацаванні ў выглядзе частакола X—XI ст. Не раней XII ст. быў зроблены земляны вал з драўлянымі сценамі — гароднямі. З XII ст. на поўнач ад дзядзінца ўзнік пасад, які ў XIV ст. перайшоў за заходні абарончы роў. Сярод знаходак шкляныя і бронзавыя бранзалеты, шыферныя праслiцы, лунніцы, шкляныя пацеркі. Адна з іх лімонападобная, трайная, з сіняга напаўпразрыстага шкла. Па думцы Г.В.Штыхава, такія бытавалі ў X — першай палове XI ст. На тэрыторыі гарадзішча ў XIII ст. узнік Прапойскі замак.



Археалагічныя знаходкі з гарадзішча Замкавая гара ў Слаўгарадзе: крэсівы, фрагменты шкляных бранзалетаў, шкляныя пацеркі, шыферныя праслiцы.

Акрамя пералічаных гарадзішчаў неабходна ўспомніць і пра тыя, што існавалі, але зруйнаваны ці пашкоджаны ў недалёкім мінулым. Паводле літаратурных крыніц, вядомы гарадзішчы паміж вёскамі Старая Каменка і Дубна, каля в. Чырвоная Слабада. Іх датаванне дакладна невядома. На тэрыторыі раёна знойдзены шэ-

раг селішчаў. Далёка не ўсе з іх вывучаліся, таму дакладна датаваць многія з такіх помнікаў немагчыма. Яны, як і гарадзішчы, маглі эксплуатавацца ў жалезным веку і ў наступную феадальную пару.

Многія з іх узніклі ў жалезным веку і пакінуты носьбітамі мілаградскай, зарубінецкай і штрыхаванай керамікі культур. Пры раскопках гэтых помнікаў знаходзяць рэшткі ляпнога посуду, праслíцы, металічныя прылады працы (сякеры, сярпы, нажы), зброю (дзіды, стрэлы), упрыгожанні (бранзалеты, скроневыя кольцы, пярсцёнкі, каралі) з каляровых і чорных металаў, шкла, косці, рэшткі паўзямлянак і наземных жытлаў слупавай канструкцыі.

У эпоху Кіеўскай Русі (апошняя чвэрць 1-га тысячагоддзя н. э. – XIII ст.), калі ў басейне Сожа рассяляліся радзімічы, на месцы селішчаў часта ўзнікалі вёскі, на месцы гарадзішчаў узводзілі замкі і крэпасці. Курганы скончылі насыпаць у XIII–XIV ст.

Селішчаў феадальнай пары знойдзена шмат. Яны вядомы каля Слаўгарада (за 1 км на ўсход на дзюне ў левабярэжжы Проні, за 1,3 км на ўсход пры ўпадзенні Проні ў Сож, на правым беразе Сожа і, нарэшце, за 3,5 км на паўднёвы ўсход ад горада, на дзюне левага берага Проні); каля в. Гайшын на яе паўднёва-ўсходняй ускраіне і за 0,5 км на поўдзень; за 1,5 км на паўднёвы захад ад в. Аляксандраўка; за 1,5 км і 1,7 км на поўдзень ад в. Рудня на правым беразе Сожа; пры ўпаданні р. Пясчанка ў Сож, каля в. Барсукоўка, каля в. Дубна, ва ўрочышчы Башарына поле і каля воз. Святога каля в. Казакоўка. Амаль усе яны ўтрымліваюць матэрыялы эпохі Кіеўскай Русі і толькі на некаторых (каля Гайшына, Рудні, Барсукоўкі, Дубны, Казакоўкі) ёсць дадаткова больш раннія рэчы жалезнага веку.

Больш за ўсё на слаўгарадскай зямлі засталося курганных насыпаў. Непаважлівыя адносіны да гістарычнай памяці прыводзяць да суцэльнага знішчэння гэтых журботных узгоркаў. А яны з глыбінь тысячагоддзяў даносяць да нас галасы далёкага мінулага, напамінаюць нам пра тое, што зямля гэта была населена мужнымі людзьмі, ахвяраваўшымі сваё жыццё за ідэалы свабоды.

Суцэльны некропаль (96 насыпаў) існуе за 1 км на поўнач ад в. Васькавічы. За 1,3 і 2 км на поўдзень ад в. Гайшын да нашых дзён уцалела адпаведна 5 і 65 насыпаў. Велізарны могільнік (135 насыпаў) выяўлены за 2 км на паўночны захад ад в. Дуброўка, 64 насыпы на поўнач ад в. Гіжэнка. Меншыя па колькасці курганоў могільнікі захаваліся каля вёсак Завад-Віравая (10), Іванішчавічы (9), Кулікоўка-2 (20), Пацяраеўка (18), Слаўня (10), Чарнякоўка (7), каля Слаўгарада (6). Яшчэ нядаўна былі курганы каля вёсак Азарычы, Бахань, Бярозаўка, Крамянка, Курганаўка, Чырвоная Слабада, Рэкта, Перагон, Харанеў і ў іншых месцах. Толькі некаторыя з іх раскопваліся. Гэта, акрамя памянёных курганоў бронзавага веку, курганы радзімічаў каля в. Дубна, за 5 км на паўднёвы ўсход ад Слаўгарада і каля вёсак Чарнякоўка, Васькавічы, Чырвоная Слабада.

*А.Г.Калечыц.*

## Радзімічы

Усходнеславянская этнічная супольнасць, якая склалася ў міжрэччы Дняпра і Дзясны па цячэнні Сожа і яго прытоках. Паводле летапісу, назва паходзіць ад імя Радзім, на чале з якім прыйшлі з прапольскіх (ляшскіх) зямель. Папярэднікамі радзімічаў у Пасожжы ў V–VII ст. былі плямёны так званай калочынскай культуры, якія жылі ў слупавых або зрубных паўзямлянках на адкрытых селішчах, займаліся земля-




Рассяленне радзімічаў у IX—XII ст.

робствам, жывёлагадоўляй, паляваннем, хатнімі промысламі. Іх этнічная прыналежнасць спрэчная: некаторыя даследчыкі лічаць іх балтамі, іншыя — славянамі. Найбольш даследаваныя археалагічныя помнікі радзімічаў — курганныя могільнікі X—XII ст. Пахавальныя абрады — трупаспаленне (VIII—X ст.), з канца X да пачатку XII ст. трупапалажэнне на гарызонце, у падкурганнай яме. Характэрная адзнака — наяўнасць попельна-вугальнага пласта ў форме «вогненнага круга», у цэнтр якога і клалі нябожчыка. Сярод пахавальнага інвентару шмат упрыгожанняў, прадметаў побыту, радзей сустракаюцца прылады працы. Для мужчынскіх пахаванняў характэрны паясныя кольцы, іншыя дэталі паяснога набору, зрэдку зброя. Характэрныя племянныя адзнакі радзімічаў — бронзавыя або сярэбраныя сяміпрамянёвыя і сямілопасцевыя скроневыя кольцы, біэліпсоідныя, язычковыя, пятлістыя, гронкавыя падвескі, пласціністыя грыўні. У жаночым касцюме спалучаліся сяміпрамянёвыя і пярсцёнкападобныя скроневыя кольцы, зоркападобныя спражкі, дробны бісер, золаташкляныя пацеркі і падвескі, якія сімвалізавалі нябесныя свяцілы. Знойдзены манеты, якія выкарыстоўваліся як падвескі ў маністах: дырхемы, срэбранікі Уладзіміра Святаславіча X ст. з вушкамі,

брактэаты і інш. Насельніцтва займалася земляробствам, жывёлагадоўляй, рамёствамі (жалеза- і дрэваапрацоўчае, ювелірнае, ганчарнае, гарбарнае), паляваннем, рыбалоўствам, бортніцтвам, прадзеннем, ткацтвам.

Археалагічныя даследаванні пацвярджаюць, што завяршэнне славянізацыі радзімічамі ўсходнябалцкага насельніцтва адбывалася ва ўмовах фарміравання Кіеўскай Русі. У канцы 1-га тысячагоддзя знаходзіліся на ступені фарміравання класавых адносін, упраўляліся князямі, старэйшынамі. У 885 г. кіеўскі князь Алег вызваліў радзімічаў ад залежнасці хазараў і абклаў іх данінай. У 907 г. у складзе яго войска радзімічы ўдзельнічалі ў паходзе на Візантыю, у пачатку 970-х гадоў выйшлі з-пад улады кіеўскіх князёў.

У 984 г. былі разбіты на р. Пяшчань каля Прапошаска (Слаўгарада) ваяводам князя Уладзіміра Святаславіча Воўчым Хвастом, і іх землі замацаваліся ў складзе Кіеўскай Русі. Да XII ст. адносяцца пісьмовыя звесткі пра гарады на зямлі радзімічаў — Крычаў (Кречют, 1136), Слаўгарад (Пропой ці Прапошаск, 1136), Гомель (Гомий, 1142), Рагачоў (1142), Чачэрск (Чичерск, 1159). Апошні раз радзімічы ўпамінаюцца ў летапісе пад 1169 г.

*Друкуецца паводле кн.: Археалогія і нумізматыка Беларусі: Энцыклапедыя. Мн., 1993. С. 531.*

## У складзе Смаленскага княства

Старажытнарускае княства, якое займала тэрыторыю ў вярхоўях рэк Дняпра, Заходняй Дзвіны і Волгі, суседнічала з Наўгародскай, Растоўска-Суздальскай, Чарнігаўскай і Полацкай землямі. Палітычнае адасабленне княства пачалося з 1030-х гадоў. Паводле даных археалогіі, яго тэрыторыя да III—IV ст. была заселена ўсходнімі балтамі, якія пакінулі так званую днепра-дзвінскую культуру. Змяніўшая яе ў сярэдзіне — 3-й чвэрці 1-га тысячагоддзя культура тыпу Банцараўшчыны — Тушамлі была таксама яшчэ блізкая да старадаўніх балцкіх традыцый. У VII—IX ст. на Смаленшчыну з Пскоўшчыны пашырылася культура доўгіх курганоў, на думку В.В.Сядова — славянская, на думку іншых даследчыкаў — таксама балцкая. Пра бясспрэчна славянскія плямёны тут можна гаварыць толькі з IX ст. Гэта былі крывічы, «иже седять на верхъ Волги, и на верхъ Двины и на верхъ Днепра», як гаворыць летапіс. Найбольш заселенымі часткамі Смаленскай зямлі былі зона міжрэччаў Сожа—Дняпра—Каспві, у вярхоўях Заходняй Дзвіны, у міжрэччы Дняпра — Дзясны. Смаленская зямля межавала на захадзе з Полацкай зямлёй, на поўначы з Наўгародскай зямлёй, на ўсходзе з Растова-Суздальскай зямлёй, на паўднёвым усходзе і поўдні з Чарнігаўскай зямлёй. Найбольшымі гарадамі, акрамя Смаленска, былі Мажайск, Мсціслаў, Орша, Таропец і інш.

У 1076 г., 1077—1078 гг. і 1101 г. у Смаленску княжыў Уладзімір Манамах (у 1101 г. ён адбудаваў у Смаленску царкву Успення), да 1113 г. — яго сын Святаслаў, потым другі сын Вячаслаў. Заснавальнікам самастойнай дынастыі смаленскіх князёў стаў Расціслаў Мсціславіч (княжыў у 1127—1159 гг., у 1154 г., 1159—1167 гг. вялікі князь кіеўскі), сын Мсціслава Уладзіміравіча Манамаха, унук Уладзіміра Манамаха. У 1120—1140 гг. удзельнічаў у паходах бацькі і братоў на полацкіх князёў, фінскае племя чудзь, літоўцаў, полаўцаў. Пры ім Смаленскае княства значна пашырылася і дасягнула найбольшага росквіту і магутнасці. У 1127 г. да княства была далучана тэрыторыя паўночных радзімічаў на левым беразе Сожа, паміж яго прытокамі

Асцёр (злева) і Проня (справа) з гарадамі Прупой і Крэчут (Прапойск і Крычаў), якая ў XI ст. уваходзіла ў Чарнігаўскае княства. Паводле Граматы Расціслава Мсціславіча смаленскаму епіскапу Мануілу ў 1136 г. абодва гарады былі абкладзены данінай і плацілі па 10 грыўняў серабром. На іншых далучаных тэрыторыях малых плямён паўночных радзімічаў Расціслаў арганізаваў свае ўласныя дамініяльныя ўладанні — Расціслаўль (Рослаўль) і Мсціслаўль (Мсціслаў). Рост смаленскай тэрыторыі на поўдзень закончыўся пазней. У 1142 г. Расціслаў Смаленскі рушыў у наваколлі Гомеля, дзе ўзяў «воласць іх усю» (чарнігаўцаў), але вымушаны быў, відаць, адступіць.

У сярэдзіне — 2-й палове XII ст. Смаленскае княства, якое раней адставала ў развіцці ад суседняга Полацкага княства, выйшла ў перадавыя. Князі Расціславічы занялі ключавыя пазіцыі ў кіраванні Рускай зямлёй, нездарма амаль усе смаленскія князі пабывалі на кіеўскім княжанні: Расціслаў Мсціславіч і яго сыны Раман і Рурык, унук Мсціслаў Раманавіч і сын Мсціслава — Раман. Старэйшая іх лінія па-ранейшаму княжыла ў Смаленску. Адасабленне Смаленскага княства і паступовае эканамічнае і палітычнае яго ўзмацненне адлюстраваліся ў стварэнні самастойнай смаленскай епіскапскай кафедры (1136), шырокім будаўніцтве як у сталіцы, так і ў іншых гарадах княства. Засяродзіўшы ў сваіх руках гандаль па Заходняй Дзвіне ў першыя дзесяцігоддзі XIII ст., Смаленск стаў адным з буйнейшых гандлёвых цэнтраў Русі, пра што сведчыць дагавор Смаленска з Рыгаю і Гоцкім берагам (Готландам) 1229 г. Сведчаннем высокага развіцця культуры Смаленскай зямлі з'яўляюцца помнікі дойлідства, літаратуры і летапісання, першакласны жывапіс.

Пераемнікамі Расціслава Мсціславіча на смаленскім княжанні былі Раман Расціславіч (1160—1180), Давыд Расціславіч (1180—1197), Мсціслаў Раманавіч (1197—1214), Уладзімір Рурыкавіч (1216—1219), Мсціслаў Давыдавіч (1219—1230), Святаслаў Мсціславіч (1232—1239) і іншыя, пры якіх пачалося феадальнае драбленне Смаленскага княства на ўдзелы, памяншэнне яго ўплыву на агульнарускія справы. У 2-й палове XII ст., відаць, вылучыўся самы буйны ўдзел — Таропецкае княства, у 2-й палове XIII ст. вылучыліся Мажайскі і Вяземскі ўдзелы. Гэта аслабіла Смаленскае княства ў барацьбе з літоўскімі князямі. Князь Святаслаў Іванавіч (1358—1386) вёў энергічную барацьбу з Літвой за незалежнасць Смаленскага княства, аднак атрымаў паражэнне і загінуў у бітве на р. Вехры. Смаленскае княства было захоплена вялікім князем Вялікага княства Літоўскага Вітаўтам. У 1401 г. у Смаленскім княстве адбылося паўстанне супраць улады літоўскіх князёў, смаленскім князем стаў Юрый Святаславіч, аднак у 1404 г. Смаленск зноў быў узяты Вітаўтам. Смаленскае княства ўвайшло ў склад Вялікага княства Літоўскага.

## Прупой — Пропошеск — Прапойск — Слаўгарад

Летапісны Прапойск першапачаткова ва Устаўнай грамаце 1136 г. смаленскага князя Расціслава Мсціславіча называецца Прупой — «На Прупои 10 гривен» (падатку). Відаць, тут «у» на месцы «о» ў выніку агублення ад суседства губных зычных. Гэта мясцовая фанетычная рыса. Традыцыйна, так і цяпер вымаўляюць Прупойск, Прапуйск, Прапоськ... Магчыма, назва Пропой абазначала хуткае цячэнне р. Проня пры ўпадзенні яе ў Сож. Горад стаіць тут жа, на высокім правым беразе р. Сож. Можа, так называлася р. Проня. Пра верагоднасць такога найменя выказваліся думкі і раней. Аднолькавая частка (фармант) слова адзначаецца

і ў былой, нават у сярэдневякоўі і ў XX ст., назве р. Проня — Пропасць. Не выключана і тое, што назва Проня ёсць суседні пераклад назвы Пропасць.

На працягу гісторыі формы наймення гэтага горада былі розныя, але аднакарэнныя. Яны захаваліся і зараз. Варыянтнасць можа сведчыць аб існаванні іх раней у гаворках Слаўгарадчыны.

Вядома і такая назва, як Пропошескъ. Яна адзначана ў Грамаце Ягайлы Скіргайлу 1387 г. — Proposzesk. Ёсць і іншыя яе формы: Пропышеск, Пропашеск. Мовазнавец Я.Ф.Карскі знаходзіў з'яўленне формы Прапойск з Пропошеск у выніку пераходу ў старой беларускай мове вельмі мяккага «ш» у «й». Быццам гэта форма фіксуецца да 1529 г. Наступнымі адзначаюцца формы Пропостк (1480), Пропостес (1526), Пропостьскъ (1529), а ў напісанні рускіх купцоў, якія, як сведчыць гісторыя, часцяком наведвалі наш горад, — Пропорск (1488), Пропорьск (1489). На геаграфічных картах галандскіх, французскіх, нямецкіх выдавецтваў сустракаем наступныя напісанні: Propotsko (1589), Propoysk (1617), Propojsk (1772), Proposk (1703), Propoisik (1775), Propoisk (1831) і г.д.Трэба адзначыць, што замежныя картографы часта дакладна адзначалі вымаўленне геаграфічных назваў.

Мясцовае вымаўленне XIX ст. запісалі этнографы і самі прапайшчане ў сваіх прашэннях і адказах розных «опросных» лістоў: Пропольск (1910), Прополск (1914). Апошняя форма чамусьці пераважае ў суседніх раёнах, у іншых абласцях Беларусі.

Сучаснае мясцовае вымаўленне ў сваім актыўным і пасіўным запасе захоўвае многія гістарычныя формы. Напрыклад: «Пашоў у Прупоў і пуцулуваў у прабой», «Прапосіск», «Прапошыск тэй банбілі», Прапойськ, Прапось, Прапосік, Прапойсік, Прапойсык, Прапойсак, Прапойісык, Прапольск і памяншальна-ласкальныя формы Прапойсічык, Прапасёк, Прапайсёк.

Жыхароў называюць так: прапойскія людзі, прапайшчане, прапойсцы, прапосцы, прапасцы. Ёсць мажлівасць параўнаць, як амаль 500 гадоў назад называлі жыхароў Прапойскага староства (з 1511) — «державцею Пропостьскимъ», «у Прапойску замок людми нашими Пропойчичаны и Чычераны... ...волости нашы Пропостьско и Чычерескъ» (Литовская метрика, 1518. Кн. 11. С. 33).

На пытанне: «Дзед, што йта зы Прапосік?» — адразу пальецца нізка паданняў.

Першае з іх. Назва Прапойск паходзіць ад слова «пропасць». «Так завуць, што тут зуўсягды была пропасць ўрыгам. Тут і швед шапку пыціраў, яго разбілі. Тут і хранцузаў разбілі. А ў ету вайну немца разбілі». Звычайна расказ дзяды заканчвалі прароцтвам: «І дзеткі, калі яшчэ будзя выйна, тут складуць народы аружыю ў капцы і нарыюць курганы. Пропысць войнным тут будзя». (Мо гэта людзі чарнобыльскую навалу адчувалі?!)

Тут чытачу прыгадаем гістарычную і вельмі нядаўнюю мясцовую назву ракі Проні (Броні) — Пропасць. Параўнайце: «С того болота речкою Готыгоною у реку Пропасть, а от реки Пропасти рубежами по деревю у реку Крупецъ» (Инвентарь Дубровенский). У в. Дужаўшчына 95-гадовы дзед Гулідаў Сцяпан у 1959 г. паведаміў, што яго цесць называў р. Проня Пропасць. Сапраўды, назва Пропасць адпавядае сутнасці ракі. На ёй было шмат віроў і дно было небяспечнае, зменлівае. На месцы брадоў узнікалі віры, плывучыя наносы і г.д.

Паводле другога падання, назва Прапойск паходзіць ад слова «пропуск», гэта значыць на Проні, каля в. Чырвоная Слабада і ніжэй Прапойска, на Сожы, каля в. Гайшын, ёсць брады. Па іх у Вялікую Айчынную вайну, у час вайны са шведамі і французамі войскі пераходзілі гэтыя рэкі. Як бачым, што і гэта тапаграфічная асаблівасць адбілася ў паданні і, магчыма, ў назве Прапойск фармантам «ск».

Вось які багаж гісторыі нясе на сабе адна назва населенага пункта. У ёй змяшчаецца і пазнавальны аспект, і патрыятычны, і фальклорны.

*І.Я.Яшкін.*